# ДАРОЖНАЯ МАПА ПАДТРЫМАННЯ І РАЗВІЦЦЯ ГАЛІНЫ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў 2025-2027 ГГ

## УВОДЗІНЫ. КАНЦЭПТУАЛЬНЫ ФОН

**Зараз у Беларусі культура застаецца адным з галоўных фактараў захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, сродкам актыўнай барацьбы з агрэсіўнай палітыкай русіфікацыі і асіміляцыі беларусаў, пляцоўкай для выяўлення грамадзянскай актыўнай пазіцыі і сродкам барацьбы за свабоду і правы чалавека** на фоне таталітарнай і рэпрэсіўнай практыкі беларускага рэжыму. Лукашэнкаўскія ўлады добра разумеюць ролю культуры ў абуджэнні грамадства і супрацьстаянні іх палітыцы знішчэння нацыянальнай самасвядомасці, таму беларускія творцы і культурніцкія арганізацыі сталіся аб’ектам рэпрэсіяў беспрэцэдэнтнай інтэнсіўнасці.

**Культурная сфера з’яўляецца адным з галоўных інструментаў барацьбы за пашырэнне дэмакратыі, носьбітам і сродкам выказвання каштоўнасцяў чалавека.** Гэтая задача выглядае асабліва значнай на фоне агрэсіўнага ўплыву школы і прапаганды на маладое пакаленне беларусаў, дзе ідэалагічныя нормы, скажонае разуменне гісторыі і спрошчаны погляд на беларускую культуру прыводзяць да абыякавага стаўлення моладзі да дэмакратычных каштоўнасцяў, інкарпарацыі іх у расейскую культуру і сам дзяржаўны праект, які цяпер мае непрыхаваны мілітарысцка-імперскі характар.

**Дарожная мапа аддае прыярытэт дэмакратычным каштоўнасцям з такімі асноўнымі скразнымі тэмамі як** структураваная інтэграцыя культурных правоў у правы чалавека, а таксама ацэнка разнастайнасці і захаванне прынцыпаў роўнасці. Мапа выступае за фармаванне гендарнай роўнасці ў культурніцкай сферы шляхам барацьбы са стэрэатыпамі, а таксама пашырэння магчымасцяў і вырашэння праблем, з якімі сутыкаюцца прадстаўнікі ўсіх полаў. Падтрымка беларускай мовы і культуры мае ключавое значэнне, разам са змаганнем з дыскрымінацыяй і адстойваннем права нацыі на сваё культурнае развіццё як фундаментальнае права чалавека.

**Паводле маніторынгу Беларускага ПЭН-цэнтра, больш за 150 дзеячаў культуры цяпер знаходзяцца за кратамі і маюць статус палітвязняў, штогод у Беларусі фіксуюць больш за тысячу парушэнняў культурных правоў, вядомыя выканаўцы і музыкі спазналі крымінальны пераслед. Грамадскі актывіст і мастак Алесь Пушкін памёр у турме (медыцынская дапамога не была яму аказаная своечасова), творы беларускіх пісьменнікаў уключаныя ў «экстрэмісцкія спісы», іх ліквідуюць з крамаў і вымаюць з бібліятэк, грамадска-забаўляльныя мерапрыемствы праводзяцца пад строгім наглядам уладаў.**

Дакумент падрыхтаваны ў межах Ацэнкі патрэбаў сектара грамадзянскай супольнасці на 2025-2027 гады на замову DG NEAR (Генеральны дырэктарат па пытаннях суседства і перамоваў аб пашырэнні) і Каардынацыйнай Рады Беларускага дэмакратычнага руху. Асноўныя ўкладальнікі: Беларуская Рада культуры, Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні Аб’яднанага Пераходнага Кабінета, галіновыя культурніцкія арганізацыі і ініцыятывы.

# ВЫКЛІКІ І МАГЧЫМАСЦІ, ПАВОДЛЕ АЦЭНКІ ПАТРЭБ–2024

**1. Арганізацыі і сектары культуры ў Беларусі сутыкаюцца са значным недахопам фінансавання,** з абмежаваным доступам да дзяржаўных бюджэтаў і скарачэннем альтэрнатыўных крыніц фінансавання. З 2020 года прыватнае мецэнацтва таксама амаль цалкам знікла.

**2. Недахопы кіравання і прасоўвання.** Беларускім культурніцкім камандам і ініцыятывам не хапае дасведчаных праектных і камунікацыйных менеджараў, што дадаткова ўскладняецца неадпаведнай адукацыяй. Платформы, прызначаныя для прасоўвання, часта не звязваюць дзеячаў культуры з патэнцыяльнымі інвестарамі.

**3. Захаванне беларускасці.** Пераход на замежную аўдыторыю раствярае беларускі культурніцкі прадукт, што вядзе да зніжэння канцэнтрацыі выразна беларускага кантэнту. Ізаляцыя ўзмацняе фрагментацыю аўдыторыі, перашкаджаючы ўздзеянню культуры на грамадства. Акрамя таго, існуе дэфіцыт культурніцкіх прадуктаў для фарміравання ў дзяцей сваёй культурнай і грамадзянскай ідэнтычнасці.

**4. Абмежаваная інфраструктура за мяжой.** Тэхнічных і чалавечых рэсурсаў не хапае для наладжвання паўнавартаснага культурнага цыкла. Праз недахоп уласнай інфраструктуры сектары, звязаныя з тэатрам, кінавытворчасцю і мастацтвам, могуць разлічваць у асноўным на мясцовыя пляцоўкі. Каналы фінансавання і распаўсюду абмежаваныя. Да таго ж адсутнічае юрыдычная і сацыяльная падтрымка дзеячаў культуры.

**5. Не хапае ініцыятыўных лідараў** для аб’яднання культурных нішаў і вырашэння праблем, характэрных для галін.  Прафесійныя сеткі і асацыяцыі знаходзяцца ў стадыі нараджэння і не маюць арганізацыйнай стабільнасці.

# МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ І РОСТУ

**1. Павелічэнне вытворчасці беларускага культурніцкага кантэнту** з 2020 года адкрывае перспектывы для пашырэння беларускай ідэнтычнасці, у тым ліку мовы і нацыянальнай арыентацыі.

**2. Выхад на міжнародныя культурніцкія рынкі** забяспечвае доступ да глабальнай аўдыторыі, дазваляючы беларускай культуры інтэгравацца ў агульнаеўрапейскі кантэкст і пераймаць разнастайны культурны досвед.

**3. Развіццё культурніцкай інфраструктуры,** ліквідацыя прабелаў у вытворчасці, сістэмах распаўсюджвання, крытыцы і павышэнне патэнцыялу культурніцкага менеджменту. Да добрай практыкі можна аднесці пашырэнне сетак распаўсюджвання літаратуры і кіно ў інтэрнэце.

**4. Самаарганізацыя і супрацоўніцтва.**  Дзеячы культуры арганізоўваюцца і супрацоўнічаюць унутры галіны, каб адказваць на патрабаванні і выклікі праз стварэнне кааліцый і самарэгуляванне, уплываючы на беларускую культурніцкую палітыку.

**5. Пашырэнне практык міждысцыплінарнага і міжсектаральнага супрацоўніцтва** спалучае розныя сферы культуры, мастацтва і новыя тэхналогіі, спрыяючы інавацыям у беларускай культурніцкай сферы.

**6.** Пашыраюцца **нефармальныя каналы культурніцкай дыпламатыі**, якія становяцца альтэрнатывай афіцыйным каналам міжнароднага супрацоўніцтва. Развіццю культуры спрыяе ўмацаванне беларускіх дыяспар.

# СТРАТЭГІЯ І ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ НА ПЕРЫЯД 2025-2027 ГГ.

## ПРЫЯРЫТЭТ 1. ПАШЫРЭННЕ РАСПАЎСЮДУ КУЛЬТУРЫ

**Фінансавая падтрымка:**

- Прапаганда беларускай культуры для супрацьдзеяння расейскай прапагандзе.
- Стварэнне і распаўсюджванне сучасных беларускіх культурніцкіх наратываў.
- Рэалізацыя міжсектаральных праектаў у сферы культуры, адукацыі, СМІ, IT, бізнесу і грамадзянскай супольнасці.
- Правядзенне сістэматычнага аналізу і экспертызы ўплыву культурніцкіх прадуктаў і практык на палітычную, сацыяльную і эканамічную сферы.
- Павышэнне развіцця аўдыторыі беларускай культуры праз: а) развіццё каналаў распаўсюджвання і запуск рэкламных і камунікацыйных кампаній б) прадастаўленне мастацкай і культурніцкай адукацыі, уключаючы праекты, арыентаваныя на дзяцей, падлеткаў, моладзь і людзей сталага веку.

**Асноўныя вынікі працы:**

- Павелічэнне колькасці культурніцкіх і міжсектаральных прадуктаў, якія прасоўваюць беларускую культуру і гісторыю: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Дыверсіфікаваныя каналы размеркавання і меры бяспекі: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Пашырэнне ахопу аўдыторыі за кошт рэкламных і камунікацыйных кампаній: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).

**Прамежкавае падсумаванне: €2,700,000**

## ПРЫЯРЫТЭТ 2. КУЛЬТУРНАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ І ДАСТУПНАСЦЬ

**Фінансавая падтрымка:**

- Павелічэнне аб'ёму культурніцкага кантэнту і пераклады на іншыя мовы: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Пашырэнне разнастайнасці культурніцкіх, адукацыйных і даследчых прадуктаў: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Структураваная інфармацыя аб культурніцкіх правах у Беларусі: 150 000 еўраў (50 000 еўраў штогод).
- Прававая дапамога і сацыяльная абарона беларускіх артыстаў: 300 000 еўраў (100 000 еўраў штогод).

**Асноўныя вынікі працы:**

- Павелічэнне аб'ёму культурніцкага кантэнту і пераклады на іншыя мовы: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Пашырэнне разнастайнасці культурніцкіх, адукацыйных і даследчых прадуктаў: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Структураваная інфармацыя аб культурніцкіх правах у Беларусі: 150 000 еўраў (50 000 еўраў штогод).
- Прававая дапамога і сацыяльная абарона беларускіх артыстаў: 300 000 еўраў (100 000 еўраў штогод).

**Прамежкавае падсумаванне: €2,250,000**

## ПРЫЯРЫТЭТ 3. РОСТ КУЛЬТУРНІЦКАЙ ПРАДУКЦЫІ

**Фінансавая падтрымк:**

- Мастацка-культурніцкія праекты ў Беларусі, за мяжой і ў трансгранічным фармаце.
- Развіццё інстытутаў, якія забяспечваюць вытворчы цыкл усіх падсектараў культуры, і развіццё экасістэмы культуры.
- Навучанне і падрыхтоўка новага пакалення менеджараў культуры (як у еўрапейскіх навучальных установах, так і ў нефармальнай адукацыі).
- Прапаганда дабрачыннасці, прыватнага мецэнацтва і падтрымкі культуры сярод прадстаўнікоў бізнесу з беларускімі каранямі; развіццё краўдфандынгавых пляцовак.

**Асноўныя вынікі працы:**

- Павелічэнне беларускай культурніцкай прадукцыі: 4 500 000 еўраў (1 500 000 еўраў штогод).
- Павелічэнне мастацкага і адукацыйнага кантэнту для дзяцей: 1 500 000 еўраў (500 000 еўраў штогод).
- Развіццё ўстойлівай трансгранічнай экасістэмы: 3 000 000 еўраў (1 000 000 еўраў штогод).

**Subtotal: €9,000,000**

## ПРЫЯРЫТЭТ 4: СТРАТЭГІЧНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

**Фінансавая падтрымка:**

- Рэгулярныя даследаванні, аналіз палітыкі ў галіне культуры.
- Развіццё гарызантальных сувязяў: кааліцый і пляцовак для ўзаемадзеяння зацікаўленых бакоў па стратэгічных пытаннях культурніцкага развіцця.

**Палітычная падтрымка:**

- Развіццё палітычнага дыялогу паміж беларускімі культурніцкімі арганізацыямі і грамадзянскай супольнасцю па пытаннях замежнай дапамогі (уключаючы працэс ацэнкі патрэбаў).
- Павышэнне ролі беларускіх суб’ектаў як выканаўцаў або (су)выканаўцаў праграм падтрымкі (па падсектарах).
- Арганізацыя камітэтаў грамадзянскай супольнасці, а таксама кіруючых камітэтаў вакол донарскіх праграм.

**Асноўныя вынікі працы:**

- Распрацоўка новых правілаў суіснавання: 300 000 еўраў (100 000 еўраў штогод).
- Стварэнне прасторы для стратэгічнага ўзаемадзеяння: 600 000 еўраў (200 000 еўраў штогод).

**Прамежкавае падсумаванне: €900,000**

## ПРЫЯРЫТЭТ 5: ЕЎРАПЕЙСКАЯ (МІЖНАРОДНАЯ) ІНТЭГРАЦЫЯ І БАЧНАСЦЬ

**Фінансавая падтрымка:**

- Сумесныя мультыкультурніцкія праекты, створаныя беларускімі актарамі ў супрацоўніцтве з замежнымі партнёрамі/выканаўцамі.
- Культурніцкая мабільнасць (у тым ліку удзел у фестывалях, канферэнцыях, сетках, прафесійных конкурсах, паказах і г.д.).
- Праграмы перакладу (кнігі, мастацкія, навуковыя, даследчыя тэксты на беларускую мову і з беларускай мовы, субтытры да кінафільмаў і тэатральных спектакляў і інш.).
- Магчымасці вывучэння замежных моў дзеячамі беларускай культуры.

**Асноўныя вынікі працы:**

- Павелічэнне вядомасці беларускай культуры ў еўрапейскіх грамадствах: 900 000 еўраў (300 000 еўраў штогод).
- Сяброўства дзеячаў беларускай культуры ў Еўразвязе і рэгіянальных сетках: 150 000 еўраў (50 000 еўраў штогод).
- Стварэнне Інстытута прамоцыі беларускай культуры: 300 000 еўраў (100 000 еўраў штогод).

**Прамежкавае падсумаванне: €1,350,000**

## МЕХАНІЗМЫ ФІНАНСАВАННЯ / ПРАГРАМЫ

- EU4Culture, EU4Belarus праз ArtPower Belarus.
- Creative Partnership, Creative Europe.
- MOST+.
- Belarus Beehive.
- Праграмы падтрымкі грамадзянскай супольнасці краін Еўразвязу: SALT-2,3, OCTOPUS для падтрымкі адукацыі.
- Праграмы краін Еўразвязу для нацыянальных меншасцяў Eurimages (Літва, Польшча).
- Беларускія выканаўцы (кансорцыумы)
  - дзейнічанне ў супрацоўніцтве з АГС краін Еўразвязу.
- Стратэгічныя партнёры Еўразвязу ў партнёрстве з беларускімі АГС.

## ВЫКАНАЎЦЫ

- Форум грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства.
- Краіны Еўразвязу і муніцыпальныя ўстановы.
- Дацкі інстытут культуры, Інстытут імя Гётэ, Польскі інстытут і іншыя чальцы EUNIC (Аб’яднанне інстытутаў культуры краін Еўразвязу).
- Фонд новай дэмакратыі, Данія (NDF).
- Літоўскі інстытут, Цэнтральнае агенцтва кіравання праектамі (CPMA) Літвы, кансорцыум Clearing House.
- Каардынацыйныя цэнтры Creative Europe.

**Арыентыровачны сумарны запыт на падтрымку ў галіне культуры складае 16 200 000€, або 5 400 000€ на год**

**Рэдакцыя:** Таццяна Пашавалава, Беларуская Рада культуры (byculture.org), Павел Баркоўскі, Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні Аб’яднанага Пераходнага Кабінета Беларусі (revivalbelarus.org), Кацярына Раманчык, sekktor media initiative (sekktor.online).
**Каб атрымаць дадатковую інфармацыю, калі ласка, звяжыцеся з намі: cp@byculture.org.**